## ПЛЫВІ, ПЛЫВІ, ВЯНОЧАК



Да вогнішча выходзіць юнак і ўзнімае сурму. Гучыць пачатковы радок беларускай народнай песні «Ой, рана, на Йвана».

**Купаліш:** Сёння Купала, заўтра Ян,
Пайшлі дзевачкі ў зялёны гай,
Павілі дзевачкі вяночкі,
Паняслі іх у таночкі,
Паклалі на галавочкі,
Каб дзівіліся парубочкі
На харошыя вяночкі.

**Купалінка:** Станьце, дзевачкі, ў кружочак,
Паварожым на вяночак;
Мы вяночак развіваем
Ды на долечку гадаем:
Калі ваша добрая доля —
Цвіці, вяночак, як гаёчак.
Калі й ваша бяздолейка —
Сохні, вяночак, як сухарочак.

Гучыць музыка. Купалкі запрашаюць дзяўчат у круг. У цэнтры круга становіцца Дзеўка-купалка — прыгожая дзяўчына, якая ўпрыгожана кветкамі, травамі. Вочы яе завязаны хусткай. На руках вісяць засохлыя і свежыя вяночкі. Пад музыку дзяўчаты ідуць па кругу, а купалка надзяляе іх вянком-доляй: каторай дастанецца свежы вянок — той жыць багатай весела, а каторай завялы — той не пашанцуе. Пасля гульні-варажбы ў цэнтр круга дзяўчаты ўносяць «май»— бярозку, якая засталася ад сёмухі.

**Купалінка:** А цяпер, дзяўчаты, кідайце вашы вянкі на бле-бярозу. Калі ваш вянок утрымаецца на бярозе — вас хутка спаткае каханне. Жадаю шчасця!

Гучыць музыка. Дзяўчаты кідаюць вянкі на бярозу і весела абмяркоўваюць вынікі варажбы.

**Купалінка:** Разыдзіся, наш кружочак,
Зноў варожым на вяночак.
Падыдзіце да кастрышча,
Пачнем новае ігрышча:
Чый вянок згарыць хутчэй —
Тая выйдзе замуж раней.

**Купаліш:** Калі хлопец з вогчішча выхапіць вяыок —
Тая дзяўчына запросіць яго ў танок.

Пад музыку дзяўчаты кідаюць вянкі ў касцёр. Пачынаецца гульня-варажба, пасля якой фальклорны ансамбль выконвае польку-весялуху. Моладзь танцуе. Гучыць мелодыя беларускай народнай песні "Купалінка".

**Купалінка:** Знімайце, прыгажуні, свае дзявоцкія кароны, нясіце іх цару вадзяному, а ён скажа, каму ў гэтым годзе выпадзе шчасце.

Пачынаецца шэсце да ракі ці возера. Парадак шэсця:

— Чатыры дзяўчыны ў беларускіх пацыяналыіых строях, нясуць на высока ўзнятых руках невялічкі плыт. На гэтым плыце ляжыць вялізны вянок, сплецены з галінак бярозы, дуба, вярбы. Унутры вянка палае агонь.

— Чатыры юнакі з палаючымі паходнямі.

— Музыкі.

— Дзяўчаты, удзелыніцы купальскай варажбы, якія нясуць у руках вяночкі з палаючымі свечкамі.

— Фальклорны калектыў, які спявае песні.

— Астатнія ўдзельнікі свята.

У час шэсця гучыць купальская песня:

Пойдзем, пойдзем лугам,
Лугам зелянянькім.
А у лузе цвітуць вяночкі,
Там дзяўчаты водзяць таночкі.
Много песень спета
Пра шчодрае лета,

Толькі Ганначка не спявае,
У буйных травах кветкі збірае.
Кветкі збірае
У вянок уплятае.
— Пакаціся, вяночак, у дварочак,
Дзе жыве мой мілы дружочак.
Хай ён знае, знае,
Хто яго чакае,
Хай вячэрняй роснай парою
У луг зялёны прыйдзе за мною.
Пойдзем, пойдзем лугам,
Лугам зеляненькім,
А ў лузе цвітуць цвяточкі,
Там дзяўчаты водзяць таночкі.

Падышоўшы да ручаіны, ракі ці возера, усе спыняюцца. Пад мелодыю беларускай народнай песні «Купалінка» хлопцы з паходнямі заходзяць у ваду і запальваюць кола – сімвал сонца, якое трымаецца на шасце, што ўмацаваны на нерухомым плыце. Дзяўчаты апускаюць на ваду вялікі вянок з палаючым агнём, які павольна гайдаеццца на хвалях і плыве. Фальклорны калектыў выконвае купальскую песню:

Купала, Янава ночка невялічка, Купала,
Нашы дзевачкі ўсю ноч не спалі, Купала,
Усе зязюленькі, ўсе шчабяталі, Купала,
Дзевачкі, з руты вянкоў не віце, Купала,
Дзевачкі, рана замуж не ідзіце, Купала,
Віце вяночкі ды із чабору, Купала,
Ідзіце замуж ды ўпору, Купала.
(г. п. Лоеў Гомельская вобл.)

**Купаліш:** Сёння Яна-Купала,
Дзевачкі кветкі збіраюць,
Да ў у вяночкі сплятаюць,
Да й на вадзіцу пушчаюць.

***Купалінка:*** Плыві, вяночк,
Плыві, зеляненькі,
Пакажы, ці лёс мне
З міленькім, радненькім.

Дзяўчаты, трымаючы ў руках вяночак з запаленай свечкай, па чарзе падыходзяць да берага і, апускаючы вянкі на ваду, прыгаворваюць:

— Хай будзе адзін, ды ладны.

— З тварам да вянца, а з розумам да канца.

— Ці з перцам, ці не з перцам,
Абы са шчырым сэрцам.

— Калі любіш — ажаніся,
А не любіш — адкажыся.

— Хоць вох, ды ўдвох. (і да т. п.)

Гучыць пяшчотная лірычная мелодыя. Паволі плывуць на хвалях вяночкі, пабліскваючы агеньчыкамі, а дзяўчаты, ідучы ўздоўж берага, пільна сочаць за сваімі вянкамі... Хай напаткае іх радасць, вялікае каханне і шчаслівы лёс.